***І. М. Саматыя (Рэспубліка Беларусь, г. Мінск,***
***Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт)***

# ВЫВУЧЭННЕ ФУНКЦЫЙ ІНФІНІТЫВА НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ (8 КЛАС)

У лінгвістыцы, як адзначана ў Беларускай граматыцы, “інфінітыў (неазначальная форма дзеяслова) толькі называе дзеянне або стан прадмета, асобы, але не ўказвае на дзеючую асобу” [1, с. 147]. Інфінітыў не выражае значэнняў часу, ладу, ліку і асобы: *Прыемнасць – пазнаёміцца з чалавекам ветлым, радасць – пагутарыць з разумным, удача – знайсціся ў патрэбе са смелым, шчасце – жыць, працаваць з чалавекам сумленным* (М.Танк). З марфалагічных значэнняў, уласцівых дзеяслову, прысутнічаюць толькі значэнні трывання і стану (*лячыць – вылечыць – вылечыцца*).

Цікава характарызаваў інфінітыў вядомы мовазнавец, аўтар падручнікаў па беларускай мове для школ Язэп Лёсік: “Інфінітыў вытварае сваім асноўным значэньнем у мове – *называць,* а ня выказваць. Возьмем, напрыклад, дзеяслоў "*хачу*". Хацець можна шмат чаго, але сам гэты дзеяслоў назваць гэтага ня можа. Тады прыходзіць да яго на падмогу інфінітыў, і мы кажам: хачу *есьці,* хачу *спаць,* хачу *піць,* хачу *гуляць,* хачу *вучыцца,* хачу *жаніцца* і т. далей. З гэтых прыкладаў мы бачым, што дзеяслоў "хачу" выказаў, выявіў, а інфінітыў назваў наша хаценьне, назваў тое, чаго мы хочам. Дзеяслоў мог выказаць і нешта іншае, напр.: *стаў, зачаў, люблю есьці, спаць, гуляць* і т. далей, але інфінітыў ці іншае назыўнае слова павінны назваць тое, што мы *любім,* бо сам дзеяслоў назыўнай здольнасьці ня мае” [2].

У сістэматычным курсе беларускай мовы устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання агульнае ўяўленне пра інфінітыў разглядаецца ў 7 класе. Праграмай акрэслена тэма “Неазначальная форма дзеяслова, яе сінтаксічная роля” [3]. Адпаведна ў вучэбным дапаможніку [4] прадстаўлены тэарэтычны матэрыял: азначэнне паняцця, суфіксы інфітыва і іх правапіс, названы сінтаксічныя ролі гэтай дзеяслоўнай формы.

Прафесар В. У. Протчанка адзначаў, што “граматычнае значэнне ў сінтаксісе вызначаецца ў працэсе асэнсавання марфалагічнага выражэння кампанентаў пэўнай структуры. Часціны мовы – гэта лексіка-граматычныя класы слоў, якія ў саставе сінтаксічных адзінак утвараюць сферу граматычнай семантыкі ў саставе сінтаксічных адзінак” [5, с. 53]. А таму слынны метадыст акцэнтуе ўвагу настаўнікаў на тым, што пры вывучэнні і асэнсаванні сінтаксічных з’яў “трэба кіравацца тым, што асноўны спосаб выражэння граматычных значэнняў у беларускай мове семантычны. <…> Гэта абавязвае настаўніка праводзіць вялікую не толькі граматычную, але і

семантычную работу, неабходную для глыбокага асэнсавання зместу сказаў, іх камунікатыўнай і інфармацыйнай значнасці” [5, с. 51].

Для маўленчага развіцця навучэнцаў вельмі важна паказаць функцыю неазначальнай формы дзеяслова, дапамагчы асэнсаваць ролю гэтай дзеяслоўнай формы ў маўленні. Зыходзячы з прынцыпу пераемнасці і перспектыўнасці ў навучанні, у 8-м класе актуалізуецца інфармацыя пра тое, што інфінітыў можа быць любым членам сказа. Васьмікласнікам прапануецца на аснове матэрыялу дапаможніка [6] скласці зводную табліцу з прыкладамі, якая даказвае справядлівасць гэтага тэзіса.

Інфінітыў рухомы ў сінтаксічных адносінах: ён здольны займаць у сказе сінтаксічныя пазіцыі як галоўных, так і даданых членаў сказа. Гэта вызначаецца шэрагам умоў. У першую чаргу неабходна ўлічваць пазіцыю дзеяслова ў сказе: залежная ці незалежная.

У граматычнай аснове “інфінітыў + інфінітыў” адна з неазначальных формаў знаходзіцца ў пазіцыі дзейніка, другая – ў пазіцыі выказніка. Напрыклад, у двухсастаўным сказе *Нялёгкая гэта работа – сабраць словы ў сказы, выказваючы свой погляд на праблему* (Г. Пупач) незалежны інфінітыў *сабраць* з’яўляецца дзейнікам, падказка тут слова *гэта,* якое заўсёды падае сігнал пра выказнік, у нашым прыкладзе – *работа.* А ў сказе *Чытаць для мяне – найвышэйшая асалода* (Н. Гальпяровіч) неазначальная форма дзеяслова выконвае ролю дзейніка. Для замацавання гэтай інфармацыі навучэнцам прапануецца вызначыць ролю інфінітыву ў сказах тыпу: *А найважнейшая тут мэта– звярнуць з дарогі і да цёткі зайсці на час які кароткі* (Я. Колас). *Абыходзіцца з мовай абы-як – гэта значыць : думаць абы-як: недакладна, прыблізна, няправільна.*

На этапе сістэматызацыі ведаў пра спосабы выражэння членаў сказа актуальным будзе “вызначэнне мяжы выказніка ў сінтаксічных канструкцыях тыпу *вырашыў прачытаць* і *загадаў маўчаць”* [7, с. 16]. Можна прапанаваць васьмікласнікам заданне, сфармуляванае такім чынам, каб вучні самастойна змаглі зрабіць вывад пра прыём размежавання састаўнога дзеяслоўнага выказніка і спалучэння простага дзеяслоўнага з дапаўненнем, якое выражана інфінітывам. Навучэнцам прапануецца практыкаванне: “Вызначце, у якіх сказах выдзеленыя дзеясловы абазначаюць дзеянне адной і той жа асобы, а ў якіх – розных. Якімі членамі сказа з’яўляюцца дзеясловы ў неазначальнай форме?”. Маецца на ўвазе, што ў першым выпадку ўжываецца састаўны дзеяслоўны выказнік, а ў другім – спалучэнне простага дзеяслоўнага выказніка з дапаўненнем. Эфектыўным “будзе падбор параў спалучэнняў слоў, аб’яднаных адным і тым ж інфінітывам, які выконвае розныя сінтаксічныя функцыі: *збіраліся вярнуцца – прасілі вярнуцца; працягваў наведваць – раіў наведваць; пачалі збіраць – рэкамендаваў збіраць*” [7, с. 16].

Патрабуюць ўвагі і іншыя члены сказа. Напрыклад, недапасаванае азначэнне часцей за ўсё ўжываецца пры аддзеяслоўным назоўніку: *уменне*

*даравацъ, здольнасць разважаць, жаданне весяліцца,* акалічнасць мэты – пры дзеяслове руху – *прыехаў пастукаць.*

Для замацавання ўмення вызначаць ролю інфінітыва можна прапаноўваць практыкаванні на размежаванне функцый інфінітыва:

1. Сухая прыгожая восень не хацела аддаваць сваё хараство жудасным сілам вайны (І. Шамякін). 2. Я не маю права пакідаць бальніцу (М. Лынькоў). 3.Дзяўчына не магла стрымаць свайго плачу (З. Бядуля). 4.Ну, небажаты, будзем снедаць – ў людзей садзяцца ўжо абедаць (Я. Колас). 5.Садзіцеся абедаць, госцейкі дарагія. 5.Усё на свеце павучальна. Не лянуймася вучыцца (Звязда). 6.Шкада было таптаць ваўчкоў ўзорыстае лісце і жаўтаватыя пупсікі яшчэ няспелага і непрычэплівага насення (М. Кусянкоў).7. Дапамагаць нам ніхто не возьмецца. Я сказаў, што не супраць папрасіцца да барона слугаваць. Мадам Серафіна Мішэль не магла не з’явіцца паслухаць доктара, які яе так паспяхова лечыць. Французскія патрыёты лічылі ганьбай пераводзіць муку, калі народ галадае (Л. Рублеўская).

Пры вывучэнні аднародных членаў сказа метадысты раяць звяртаць ўвагу на магчымую граматычную памылку – ужыванне ў рамках аднаго рада аднародных членаў назоўніка і інфінітыву: *Ганна любіла музыку і чытаць.* Атрымліваецца, што прамое дапаўненне і частка састаўнога дзеяслоўнага выказніка, які выражае асноўнае лексічнае значэнне апошняга, займаюць сінтаксічную пазіцыю аднародных членаў, і яны, адпаведна, звязаны адно з адным на аснове спалучальнай сувязі. У такім выпадку на этапе выпраўлення памылкі інфінітыў ператвараецца ў аддзеяслоўны назоўнік (*Ганна любіла танцы і спевы)* ці назоўнік (калі гэта магчыма) – у інфінітыў (*Ганна любіла танцаваць і спяваць).* У першым выпадку перад намі аднародныя прамыя дапаўненні, у другім – аднародныя састаўныя дзеяслоўныя выказнікі з агульным дапаможным дзеясловам – інфінітывам.)

Размежаванне пабочных канструкцый, у склад якіх уваходзіць інфінітыў, і членаў сказа непасрэдна звязана з пунктуацыйнай нормай: як вядома, такія канструкцыі выдзяляюцца пры дапамозе коскі.

У 8 класе навучэнцы выконваюць заданні па ідэнтыфікацыі сінтаксічных структур з пропускам знакаў прыпынку. Пры гэтым абавязковым з'яўляецца разгорнутае абгрунтаванне васьмікласнікамі свайго меркавання. Напрыклад: 1. Праз белую павалоку фіранак відаць зеляніна вазонаў… (Я. Брыль). 2. Зіма лютуе злуецца відаць не хоча ўступаць месца вясне (В. Дайліда). 3. Майстар можна меркаваць выканаў усё бездакорна. 4. Можна меркаваць што ўсё адбудзецца ў патрэбны час. 5. Пятро – няшчасны чалавек, бо долю сваю можна сказаць знявечыў з-за пасагу. 6. Ужо можна сказаць што бульба ўрадзіла.

Акрамя таго, школьнікі могуць самі прыводзіць прыклады, складаць падобныя пары сказаў.

Нельга праігнараваць на ўроках і ўжыванне спалучэнняў слоў катэгорыі стану і інфінітыву ў безасабовых сказах. Праца з інфінітывам ахоплівае многія раздзелы сінтаксісу: граматычная аснова сказа, даданыя члены сказа, аднасастаўныя сказы, сказы з аднароднымі членамі і пабочнымі словазлучэннямі. Пры іх вывучэнні патрэбна асаблівая ўвага.

Галоўнае месца ў дзейнасці навучэнцаў займае ідэнтыфікацыя граматычных з'яў мовы і выяўленне іх функцый. Пры гэтым варта выдзяляць групіроўку сінтаксічных канструкцый па той ці іншай прыкмеце, а таксама іх трансфармацыю, якая абапіраецца на патэнцыял сінтаксічнай сінаніміі, і, вядома ж, складанне ўласных сказаў у адпаведнасці з вызначанай мадэллю, уключэнне іх у тэкст. Праца з тэкстам, граматычна сфакусаваная, пашырае ўяўленне школьнікаў аб функцыях інфінітыва.

***Літаратура***


1. Беларуская граматыка. У 2-х ч.. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я.Коласа; [Рэд. М.В. Бірыла, П.П. Шуба]. – Мн. : Навука і тэхніка, 1985.
2. Лёсік, Я. Некаторы ўвагі да беларускае літаратурнае мовы. – Рэжым доступу: //https://knihi.com/ Jazep_Losik/ Niekatoryja_uvahi_ da_ bielaruskaje_ litaraturnaje_ movy.html. – Дата доступу 15.12.2021.
3. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для VII класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. – Рэжым доступу: https://adu.by/ru/homepage/ obrazovatelnyj- protsess- 2020-2021- uchebnyj-god/obshchee- srednee- obrazovanie-2020-2021/ 304-uchebnye- predmety-v-xi-klassy-2020-2021/3798- belaruskaya-mova.html. – Дата доступу 15.12.2022.
4. Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / Г.М. Валочка, В.У.Зелянко, С.А.Язерская. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2020.
5. Протчанка, В. У. Шматаспектны аналіз пры вывучэнні сінтаксісу беларускай мовы : Вучэб. дапаможнік для студэнтаў беларус.аддз-няў філал. фак. пед ін-таў. – Мн. : Выш. шк., 1987.
6. Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / З.І. Бадзевіч, І.М. Саматыя. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2022.
7. Шутан М. И. Виды заданий при изучении инфинитива на уроках по синтаксису VIII-IX классах // Русский язык в школе.– 2020. – Т.81.– № 5.– С. 15–22.